CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |
| | |

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# Egzamin maturalny *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Symbol arkusza*
MMBB-P0-**100**-2505

DATA: **15 maja 2025 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

## Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 16 stron (zadania 1–13). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
4. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
5. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
6. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w tabelkach przeznaczonych dla egzaminatora. Tabelki są umieszczone na marginesie przy każdym zadaniu.
8. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
9. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
10. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2024/2025**

## Poziom podstawowy

Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблії*;
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*;
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы; Мужыцкая праўда № 1*;
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*;
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай; Калыханка,* выбраныя вершы;
Змітрок Бядуля, *На каляды к сыну; Пяць лыжак заціркі*;
Цётка, *Шануйце роднае слова*;
Максім Багдановіч, *Апокрыф; Хто мы такія; Санет*, выбраныя вершы;
Максім Гарэцкі, *Рускі; Стары прафесар*;
Янка Купала, *Курган; Незалежнасць, Явар і каліна, Спадчына*, выбраныя вершы;
Якуб Колас, *Новая зямля, Што яны страцілі*;
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*;
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы;
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская*, выбраныя вершы;
Янка Брыль, *Галя, Маці*;
Ян Скрыган, *Слепата*;
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*;
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*);
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі, Дарога праз лес*;
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*); *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы;
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*;
Сакрат Яновіч, *Гасцінец, Прыгожай, Бацькаў гнеў, Вёха – багіня ганьбы*;
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві*..., выбраныя вершы;
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай);
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*;
Алесь Барскі, *Беластоцкі край; Я сын зямлі беластоцкай..., Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы;
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*);
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1 раздзела часткі другой).

## Poziom rozszerzony

Максім Багдановіч*, За сто лет*;
Максім Гарэцкі*, Фантазія*;
Якуб Колас*, У палескай глушы (*фрагмент *XVI часткі)*;
Янка Купала*, Тутэйшыя*;
Рыгор Барадулін*, Жыццё і паэзія*;
Сакрат Яновіч*, Пад знакам Арла й Пагоні (*фрагмент *30. Эліты)*;
Ларыса Геніюш*, Споведзь*;
Надзея Артымовіч*, Ёсць тое...,* выбраныя вершы;
Алесь Разанаў*, Sumus ne simus,* выбраныя вершы;
Вольга Рымша*, Рэквіем*;
Уладзімір Арлоў*, Незалежнасць – гэта...*;
Барыс Пятровіч*, Трызненні (*фрагмент *Шчасце быць – 1).*

## Część 1. Test językowy

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

Наталля Святлова

***Будучыня як перазагрузка***

Высокія тэхналогіі сталі яшчэ больш запатрабаванымі і выйшлі на новы ўзровень. Усё часцей інструментамі культурнай прасторы становяцца менавіта тэхналогіі. А кніга? Сціпла чакае на паліцах? Альбо ў самоце рыхтуецца да таго, калі яе канчаткова алічбуюць і „зальюць" у інтэрнэт, тым самым дадаўшы бонусаў электроннаму асяроддзю? Ці ўяўляецца бібліятэка будучыні без штучнага інтэлекту? […]

У адкрытых крыніцах ёсць версія, як будзе выглядаць інавацыйная кніга. Праект, распрацаваны ў ЗША, – „Кніга будучыні". У папяровую кнігу аўтары тэхналогіі ўманціруюць мноства датчыкаў, мікрачып, мініяцюрны праектар, а таксама дынамік. Гэта дазволіць пры перагортванні старонак адлюстроўваць дадатковы кантэнт, што дадае чытанню інтэрактыўнасці. З дынаміка – гук па тэме аповеду. Правобраз разумнай кнігі? Але ці не лішнія такія тэхналагічныя выкрутасы? Бо ўсё гэта можа зрабіць наша ўяўленне! Гэта натуральны працэс пры чытанні, калі актывуюцца вобразы, што малюе ўяўленне. У гэтым жа і смак чытання: без мноства інструментаў мы ў галаве глядзім сапраўдны фільм. І ўсё дзякуючы ўяўленню, якое дорыць кніга.

У сетцы знайшла меркаванне, што чытанне – працэс манатонны, ледзь не блізкі да сну. Асабліва пасля васьмігадзіннага рабочага дня, скардзіцца аўтар і фантазіруе: вось бы хутчэй вынайшлі тэхналогію ўлівання інфармацыі напрамую ў мозг. І тут жа прапаноўвае выйсце – тэхналогію „Шпрыц" – хуткачытанне для лянівых і стомленых. Праграма падзяляе тэкст на асобныя словы і хутка пракручвае перад вачыма чытача. Пасля невялікай трэніроўкі мозг вучыцца склейваць словы ў цэльны аповед на хуткасці 500–1000 слоў у мінуту, што ў 5–10 разоў вышэй, чым хуткасць чытання простага абывацеля. Чым не метады штучнага інтэлекту? Узаемадзеянне з ім непазбежнае. Пытанне – што стане з кнігай? Якая ёй наканавана іпастась? Чытанне папяровай кнігі стане прывілеяй інтэлігентаў, схільных да крытычнага мыслення, а чытанне-сканаванне візуальных вобразаў новых медыя – патрэбай масавай культуры? Чытанне ператворыцца ў нешта элітарнае, што дазволіць пашыраць ракурс. Дазволіць стаць вышэй над часам, а не быць яго заложнікам, паглынаючы карцінкі з новых медыя. Кніга – як вяртанне да сябе, тое, што не падуладна пераменам. І на гэтым рынгу са штучным інтэлектам у яе перавага хай невідавочная, але трывалая. Каб спыніць час – вазьмі кнігу.

Паводле Н. Святловай, *Кніга vs штучны інтэлект. На чыім баку перавага?*, http://zviazda.by/be/news

**Заданне 1. (0–2)**

**Ацані правільнасць сцверджанняў, змешчаных у табліцы. Пазнач ТАК, калі сцверджанне правільнае, або НЕ – калі няправільнае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | З часам традыцыйная кніга саступіць месца новым тэхналогіям. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Папяровая кніга не здольная ўздзейнічаць на ўяўленне чалавека. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Чытанне традыцыйнай кнігі можа ператварыцца ў элітарны занятак. | **ТАК** | **НЕ** |

1.
0–1–2

**Заданне 2. (0–1)**

**Працягні наступны сказ, пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

У сказе „Гэта дазволіць пры перагортванні старонак адлюстроўваць дадатковы ***кантэнт***, што дадае чытанню інтэрактыўнасці” выдзеленае слова з’яўляецца

**А.** дыялектызмам.
**Б.** неалагізмам.
**В.** архаізмам.
**Г.** жарганізмам.

2.
0–1

**Заданне 3. (0–1)**

**Які з прыведзеных сказаў з тэксту выконвае экспрэсіўную функцыю? Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

**А.** Высокія тэхналогіі сталі яшчэ больш запатрабаванымі і выйшлі на новы ўзровень.
**Б.** У адкрытых крыніцах ёсць версія, як будзе выглядаць інавацыйная кніга.
**В.** Але ці не лішнія такія тэхналагічныя выкрутасы?
**Г.** Якая ёй наканавана іпастась?

3.
0–1

**Заданне 4. (0–1)**

**Растлумач сваімі словамі, якую функцыю выконваюць пытальныя сказы ў першым абзацы прыведзенага тэксту.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

4.
0–1

5.
0–1–2

## Заданне 5. (0–2)

**На падставе прыведзенага тэксту сфармулюй яго асноўную тэзу і адзін аргумент.**

**Тэза**: .....................................................................................................

.....................................................................................................

**Аргумент**:

.....................................................................................................

.....................................................................................................

6.
0–1

## Заданне 6. (0–1)

**Падбяры літаратурны аналаг размоўнаму слову, узятаму ў двукоссе ў наступным сказе з тэксту.**

Альбо ў самоце рыхтуецца да таго, калі яе канчаткова алічбуюць і „зальюць” у інтэрнэт, тым самым дадаўшы бонусаў электроннаму асяроддзю?

.....................................................................................................

.....................................................................................................

7.
0–1–2

## Заданне 7. (0–2)

**Да якога стылю належыць тэкст Наталлі Святловай? Прывядзі адну яго рысу.**

Стыль: .....................................................................................................

Рыса:.....................................................................................................

.....................................................................................................

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

Wykonaj zadania. Odpowiadaj tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

### Заданне 8. (0–2)

8. 0–1–2

**Да якога жанру належыць твор Канстанціна Вераніцына *Тарас на Парнасе*? Пазнач правільны адказ сярод А–Г. Падай адну характэрную рысу гэтага жанру.**

**А.** камедыя
**Б.** трагедыя
**В.** паэма
**Г.** апавяданне

**Характэрная рыса:** ..........................................................................................................

..........................................................................................................................

### Заданне 9. (0–2)

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *Ліста з-пад шыбеніцы* Кастуся Каліноўскага.

Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, – но не жаль згінуць за тваю праўду.

Прыймі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як з таго света толькі для дабра твайго напісана.

Няма ш, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і науку. […]

Для таго, Народзе, як толька калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б’юцца за праўду й свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, за касу, сакеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за свае чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную.

Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе.

Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні

http://knihi.com

9. 0–1–2

**На падставе прыведзенага фрагмента і літаратурнага кантэксту ацані праўдзівасць наступных сцверджанняў. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Цэнтральнай ідэяй *Лістоў з-пад шыбеніцы* з’яўляецца неабходнасць узброенай барацьбы за свабоду. | **П** | **Н** |
| **2.** | *Лісты з-пад шыбеніцы* маюць на мэце заклік да адраджэння беларускай культуры. | **П** | **Н** |
| **3.** | Адрасатам *Лістоў з-пад шыбеніцы* з’яўляецца не нейкі канкрэтны народ, а чалавецтва ўвогуле. | **П** | **Н** |

10.
0–1–2

**Заданне 10. (0–2)**

**Да твораў 1–3 падбяры адпаведны літаратурны матыў А–Г. Упішы адпаведную літару ў табліцу.**

| | аўтар і загаловак | матыў |
|---|---|---|
| **1.** | Змітрок Бядуля, *Пяць лыжак заціркі* | |
| **2.** | Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі* | |
| **3.** | Васіль Быкаў, *Калі хочацца жыць* | |

**А.** канфлікт пакаленняў.
**Б.** голад.
**В.** вайна.
**Г.** непазбежнасць лёсу.

**Заданне 11. (0–2)**

Прачытай пададзены ніжэй фрагмент верша *Беластоцкі край* Алеся Барскага.

Мой Беластоцкі край – мая Айчына!
З табою звязаны мой лёс і доля.
Люблю лясы твае, люблю даліны,
Кахаю шчыра бацькаўскае поле.

Калышашся ў напевах песні роднай,
І мыеш твар у промнях залацістых,
І толькі тут я поўнасцю свабодны,
І толькі тут душой заўсёды чысты. [...]

А. Барскі, *Беластоцкі край* [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2013, с. 50.

11.
0–1–2

**Выберы і пазнач, да якой разнавіднасці лірыкі адносіцца верш Алеся Барскага. Адказ абгрунтуй.**

**А.** філасофская
**Б.** грамадзянская
**В.** інтымная
**Г.** рэлігійная

Абгрунтаванне ..........................................................................................................................

..............................................................................................................................

**Заданне 12.**

Прачытай пададзены ніжэй фрагмент аповесці Васіля Быкава *Аблава*.

– Ну, аднаго і паратунку, што кароўка. Малачко! Ды і тое здаць трэба. Дзвесця літраў. І мяса, і яйкі. І воўну. Зімой асмалілі падсвінка, дык штрафу далі пяцьдзясят рублёў. […]

– Можа, трэба было паскардзіцца? Жалабу[1] куды напісаць? – асцярожна параіў Хведар.

Стары зласнавата ўхмыльнуўся ўсім сваім касмылявым тварам.

– Каму жалабу? Начальству? Дык яны ж самі ў нас як звяры. Прыедзе каторы... Вунь гэны Роўба: усё мацюгом ды пагрозай, Сібірру палохае...

Хведар знянацку адчуў, як закалыхалася пад ім зямля і коса паплыло кудысь поле.

– Роўба?

– Ну, Роўба. Цяпер жа ён парцейны сакратар. Малады, а нібы той цівун! Ад бацькі адмовіўся. Бацька ж яго раскулачаны ў Нядолішчы, дык адмовіўся. Казалі, і прозвішча меўся мяняць, каб анізвання...

Хведар, здалося, уязджаў у зямлю, якая ўсё плыла, гойдалася навакол. Ён ужо кепска чуў, што яшчэ казаў стары, які гаварыў і гаварыў – скардзіўся, мабыць, на парадкі ў раёне. Хведар яго не слухаў. Ён так нечакана ўчуў тое пра сына, з такім нутраным болем уразіла яго тая навіна, што ён анямеў на хвіліну.

http://knihi.com

**Заданне 12.1. (0–1)**

**Растлумач, з якімі гістарычнымі падзеямі ў жыцці беларускага народа звязаны сюжэт аповесці.**

12.1. 0–1

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

**Заданне 12.2. (0–1)**

**Растлумач значэнне загалоўка аповесці Васіля Быкава.**

12.2. 0–1

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

[1] Жалаба – скарга.

**Заданне 13. (0–30)**

## Część 3. Wypracowanie

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **літаратурны твор**, згаданы ў тэме, і на **іншы твор беларускай літаратуры**.
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1.
**Якую ролю адыгрывае мастацтва ў жыцці чалавека? Паразважай над пытаннем на падставе верша Алеся Барскага *Мая паэзія – мой абавязак...* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Алесь Барскі

* * *
Мая паэзія – мой абавязак
Перад зямлёй і перад родным словам.
Стаяць паэмы і бяроз і вязаў,
Складаюцца на вечную аснову.
Айчына – незаменная ніколі,
Найбольшы з скарбаў, дадзены нам лёсам.

Вялікаю паэзіяй ёсць поле
І чыстыя бясхмарныя нябёсы.
Выходжу ў поле, кланяюся ніве,
Словы шапчу аб шчасці чалавечым,
Толькі ў мове роднай я шчаслівы,
І толькі ў мове роднай буду вечна.

А. Барскі, *Мая паэзія – мой абавязак...* [у:] Ян Карчэўскі, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 4 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2022, с. 153.

Тэма 2.
**Постаць здрадніка ў творах беларускіх пісьменнікаў. Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на адзін твор са спісу літаратуры і іншы выбраны твор беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr**

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|
| | | |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **0** | **1** | *Brak lektury obowiązkowej.* | *Nie dotyczy problemu.* | *Nie jest wypowiedzią argumentacyjną.* |

| | | | | | | | | | | | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | | | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | **0** | **1** | **2** | **3** |
| | | G | F E | C D | B |

| | | *Liczba błędów w spójności* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | | **0** | **1** | **2** | **3** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | **0** | **1** |

| | | *Liczba błędów językowych* | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | | **0** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| | | | 1G 2F 3E 2G 3F 3G | 1F 2E 3D | 1E 2D 3C | 1D 2C 3B | 1C 2B 3A | 1B 2A | 1A |

| | | *Liczba błędów ortograficznych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | | **0** | **1** | **2** |

| | | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | | **0** | **1** | **2** |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*